Жніво

# ДЗЕД МАРОЗ У ПОЛІ

Арыгінальны спосаб віншавання механізатараў з працоўнымі перамогамі прыдумалі ў жабінкаўскай гаспадарцы

**Старэйшыя памятаюць, што ў савецкія часы была традыцыя спраўляць на вытворчасці Новы год, скажам, у верасні ці лістападзе. Гэта адбывалася тады, калі нейкі вялікі альбо маленькі калектыў выконваў гадавы план датэрмінова. Найчасцей ёлку ў цэх прыносілі завадчане альбо шахцёры, часам доменшчыкі. Тады іх чакалі слава і грошы. Нярэдка ўдарнікі станавіліся героямі тэле- і радыёсюжэтаў, траплялі на першыя старонкі газет.**

Цяпер так не прынята. Ды і, напрыклад, хлебаробы па вызначэнні не могуць завяршыць год датэрмінова, бо сельгасвытворчасць цесна звязаная з прыродным цыклам. Іншая рэч, ушаноўваць перадавікоў хлебнай нівы... Герояў дня — тысячнікаў або двухтысячнікаў — звычайна вітаюць прадстаўнікі мясцовай улады, кіраўнікі грамадскіх арганізацый, шэфы з горада. А вось у ААТ «Вазнясенскі» Жабінкаўскага раёна вырашылі сваіх камбайнераў і шафёраў не проста адзначыць падарункамі і матэрыяльнай дапамогай, а і настрой ім узняць. Да іх на поле завітаў... Дзед Мароз з халоднай мінералкай і марозівам. У трыццаціградусную спёку гэта аказалася тое, што трэба.

Зімовы госць эфектна з'явіўся проста пасярод мора залатых каласоў у чырвоным атласным касцюме і адразу выклікаў усмешкі прысутных. Ну, а калі пажадаў, каб тэхніка не ламалася, надвор'е не падводзіла, а пад Новы год пад ёлкай кожны знайшоў чаканы падарунак, пазітыву яшчэ пабольшала.

Настрой, вядома, важны ў справе, якую робяць механізатары. Збіраюць гэтым летам у «Вазнясенскім» па 61 цэнтнеры збожжавых з гектара. А азімы ячмень выраc рэкордны — па 96 цэнтнераў! **Кіраўнік гаспадаркі Надзея КАНДРАЦЮК** вельмі ганарыцца сваім калектывам, лічыць, што ў самую гарачую пару, якой з'яўляецца ўборка, маральная падтрымка людзей таксама важная. Вось і прыдумалі гэтым разам візіт Дзеда Мароза ў поле. Налета будзе іншая фішка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Дакладнасць і бяспека

# І НАВАЛЬНІЦА, І ГРАД, І ШКВАЛ...

## Фіксаваць небяспечныя з'явы і папярэджваць пра іх будзе радыёлакатар, які днямі запушчаны ў аэрапорце ў Гродне

**Праект — частка сеткі метэаралагічных радыёлакатараў на тэрыторыі Беларусі, якая дазволіць стварыць адзінае радыёлакацыйнае поле і павялічыць дакладнасць штармавых прагнозаў, гарантаваць большую бяспеку палётаў грамадзянскай авіяцыі.**

Доплераўскі метэаралагічны радыёлакатар устаноўлены ў аэрапорце Гродна за 18 кіламетраў ад горада і ўяўляе сабой металічную вежу вышынёй 31,5 метра. Наверсе знаходзіцца круглы модуль і антэна. Кантэйнер мае засцерагальнае заземленне. Кошт аб'екта даволі высокі — 4,7 мільёна рублёў, з іх большая частка — затраты на абсталяванне.

Як адзначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір ДЗЯШКО,** надвор'е заўсёды цікавіць аграрыяў, дарожнікаў, будаўнікоў і наогул, усіх жыхароў. З уводам радыёлакатара прагнозы павінны палепшыцца і стаць больш дакладнымі.

Радыёлакатар дапаможа аператыўна адсочваць і прагназаваць змены надвор'я. З'явіцца магчымасць у рэжыме рэальнага часу атрымліваць інфармацыю аб месцазнаходжанні і перасоўванні вялікіх воблачных утварэнняў, а таксама ўзнікненні зон інтэнсіўных ападкаў. Можна дакладна фіксаваць зоны небяспечных з'яў, у тым ліку навальніц, граду, урагану, і сачыць за іх развіццём.

Падчас адкрыцця аб'екта **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй ХУДЫК** падкрэсліў, што аб'ект доўгачаканы, бо працяглы час метэапрагнозы знаходзіліся на даволі нізкім узроўні, і гэта выклікала справядлівыя нараканні як з боку ўлад, так і з боку грамадскасці.



Фота Мікалая ЛАПІНА.

— Доўгія гады служба Белгідрамета не задавальняла нашых грамадзян і выклікала крытыку з боку кіраўніка дзяржавы. Яго даручэнне якраз і датычылася мадэрнізацыі службы — ад навучання кадраў да стварэння сеткі сучасных аб'ектаў для назірання за надвор'ем, — падкрэсліў Андрэй Худык.

Так была распрацавана дарожная карта мерапрыемстваў на 2018-2020 гады па павышэнні якасці прагнозаў надвор'я. У адпаведнасці з ёй, прадугледжаны ўвод у эксплуатацыю метэаралагічных радыёлакатараў у аэрапортах Віцебска, Гродна і Брэста. Дарэчы, у Брэсце адпаведны аб'ект мяркуецца ўвесці ў строй да канца года.

У дарожнай карце запланаваны пуск яшчэ сямі метэаралагічных станцый, якія будуць уведзены ў эксплуатацыю ў кастрычніку гэтага года. Колькасць такіх аб'ектаў з кожным годам павялічваецца: калі ў 2017-м іх у краіне было 38, прычым толькі палова аўтаматычныя, то да канца 2020-га гэтая лічба дасягне 70, і ўсе станцыі будуць працаваць у аўтаматычным рэжыме. Толькі за мінулы год аўтаматычныя метэаралагічныя станцыі ўведзены ў 15 гарадах, а таксама шэсць дадатковых у Мінску.

Таксама вядзецца мадэрнізацыя сетак і абнаўляецца камп'ютарная тэхніка. Завершана мадэрнізацыя праграмна-апаратных комплексаў авіяцыйных метэаралагічных станцый у пяці абласных цэнтрах краіны. Яны прызначаны для апрацоўкі і перадачы метэаралагічнай інфармацыі, праз авіяцыйную станцыю з аэрапорта Гродна ў Белгідрамет па лініі сувязі.

Што датычыцца падрыхтоўкі спецыялістаў Белгідрамета, то яны павышаюць сваю кваліфікацыю на базе вучэбных цэнтраў Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, удзельніцай якой з'яўляецца і Беларусь. Акрамя таго, наша краіна — адзін з бакоў рамачнай Канвенцыі ААН па змяненні клімату, удзельніца Кіёцкага пратакола і падпісант Парыжскай дамовы. Таму Беларусь не можа заставацца ўбаку ад сусветнай глабальнай акцыі, мэта якой — не дапусціць у гэтым стагоддзі павышэння тэмпературы паветра на планеце больш чым на два градусы Цэльсія.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Надвор'е

# «Эміль» верне прахалоду

**Мінулыя выхадныя выдаліся дастаткова цёплыя. Слупок тэрмометра дасягаў адзнак у 24—30 градусаў. Агульную карціну псавалі хіба што навальнічныя дажджы, якія ў некаторых раёнах былі дастаткова моцныя.**

На гэтым жа тыдні спякота адступіць і пахаладанне пачнецца ўжо сёння. Падрабязней пра сінаптычную абстаноўку паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак праз Беларусь будзе перамяшчацца малаактыўны атмасферны фронт. Дзякуючы гэтаму тэмпература панізіцца ўдзень да адзнак у 19—28 цяпла. Невялікія дажджы пройдуць толькі месцамі, ды і тое па поўдні.

А вось у сераду набярэ моц чарговы антыцыклон. Яму далі імя «Эміль». Сфарміраваны ён у халаднаватым паветры. Таму, прынамсі да выхадных, надвор'е не будзе адрознівацца разнастайнасцю. Уначы чакаецца ад 7 да 14 цяпла, прычым 13-га жніўня будзе ўсяго ад 5 да 10 са знакам «плюс». Затое ўдзень — ад 16 градусаў на паўночным усходзе да 24—25 на паўднёвым захадзе. Ападкаў не прагназуецца.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Інданезіі прачнуўся вулкан



На інданезійскім востраве Суматра актывізаваўся вулкан Сінабунг, 10 жніўня ён выкінуў у неба слуп попелу вышынёй 5 км. Аб гэтым паведамляе нямецкая тэлерадыёкампанія Deutsche Welle.

Цэнтр вулканалогіі і зніжэння геалагічнай небяспекі Інданезіі паведаміў, што ў выніку вывяржэння не зарэгістравана ні загінулых, ні пацярпелых.

Мясцовыя ўлады заклікаюць жыхароў і турыстаў пазбягаць знаходжання ў радыусе 5 км ад кратара, а таксама выпусцілі папярэджанне аб магчымых патоках лавы. Работнік наглядальнага пункта на Сінабунгу паведаміў, што попел пакрыў ужо некалькі вёсак, якія размешчаны ў радыусе 20 км ад кратара.

У той жа час, паводле даных Упраўлення грамадзянскай авіяцыі Інданезіі, у рэгіёне прадўжаюць ажыццяўляцца авіяперавозкі.

Адзначаецца, што гэта другое за апошнія дні вывяржэнне Сінабунга, які з'яўляецца адным з больш чым 120 актыўных вулканаў Інданезіі. У час яго вывяржэння ў 2014 годзе загінулі 16 чалавек, у 2016-м — сем.

## З-за турыстаў, якія не даехалі, Францыя страціла мільярды

Французская эканоміка не далічылася ад 30 да 40 млрд еўра з-за турыстаў, якія не прыехалі гэтым летам у краіну. Аб гэтым заявіў дзяржсакратар па турызме Жан-Батыст Лемуан, паведамляе Radio France internationale.



У папярэднія гады сярэднія даходы ад турызму ў Францыі ацэньваліся ў сярэднім у 180 млрд еўра, 60 млрд з іх прыпадала на замежных падарожнікаў. Сёлета закрытыя границы і страх заразіцца або апынуцца на каранціне прымусілі многіх перагледзець свае прывычкі падарожнічаць. Аднак замежных гасцей часткова замянілі французскія адпачывальнікі, якія вырашылі не выязджаць гэтым летам за мяжу.

Кожнае лета ў Францыю прыязджае амаль 17 млн замежных турыстаў, а прыкладна 9 млн французаў адпраўляецца за мяжу. Улады разлічваюць, што турыстычнай галіне яшчэ ўдасца часткова аднавіцца ў гэтым сезоне за кошт турыстаў з Бельгіі, Германіі, Італіі і Іспаніі, якія звычайна адпачываюць у верасні.

У цэлым у свеце страты турыстычнай галіны ацэньваюцца гэтым летам у 320 млрд долараў. Са студзеня да мая 2020 года колькасць міжнародных падарожжаў скарацілася на 56 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. Пад пагрозай скарачэння апынуліся ад 100 да 120 млн работнікаў сферы турызму. Такія даныя прыводзіць Сусветная турысцкая арганізацыя.

## Мусонныя дажджы ў Пакістане: больш за 60 ахвяр

Сама меней 64 чалавекі сталі ахвярамі мусонных дажджоў і паводак у Пакістане за апошнія трое сутак, паведамляе ТАСС.

Паводле звестак пакістанскага Нацыянальнага ўпраўлення па барацьбе з наступствамі стыхійных бедстваў, найбольшая колькасць загінулых — у паўночна-заходняй правінцыі Хайбер-Пахтунхва. У рэгіёне парушана сувязь з затопленымі раёнамі, разліў рэк знішчыў сотні жылых дамоў, выклікаў абрушэнне мастоў і апор высакавольтных ліній электраперадачы.

У паўднёвай правінцыі Сінд прарыў плаціны на адным з каналаў прывёў да чалавечых ахвяр і затаплення некалькіх вёсак. Да эвакуацыі мясцовых жыхароў былі прыцягнуты армейскія падраздзяленні і верталёты. У зоне бедства ваенныя разгарнулі мабільны шпіталь, дзе аказваецца дапамога пацярпелым.

Дажджы паралізавалі нармальнае жыццё ў буйных пакістанскіх гарадах Карачы і Лахор. Вуліцы мегаполісаў затопленыя вадой, паводка значна ўскладніла работу транспарту і гарадскіх службаў.



Падобнае стыхійнае бедства церпіць і суседняя Індыя. Там з-за дажджоў і апоўзняў загінула больш за сорак чалавек.